# Падрыхтоўка будучых настаўнікаў пачатковых класаў да самаадукацыі як неабходны кампанент сучаснага вучэбнага працэсу ў педагагічным універсітэце

А. І. Андарала – дацэнт кафедры педагогікі
і псіхалогіі пачатковай адукацыі БДПУ
Г. Ф. Андарала – дацэнт кафедры
беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ

*Анатацыя*: у артыкуле разглядаецца самаадукацыйная дзейнасць як важны састаўны кампанент асобасна-прафесійнага станаўлення будучага настаўніка, раскрываецца сутнасць гатоўнасці настаўніка да самаадукацыйнай дзейнасці, аналізуецца стан гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі, шляхі фарміравання гатоўнасці да самаадукацыі будучых настаўнікаў пачатковых класаў.
*Ключавыя словы*: самаадукацыйная дзейнасць, гатоўнасць да самаадукацыі, студэнт, фактары фарміравання гатоўнасці да самаадукацыі, асобасна-прафесійнае станаўленне.

На сучасным этапе сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь істотна ўзраслі патрабаванні да падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Сёння краіне неабходны актыўныя, дзейнасныя спецыялісты, якія могуць хутка прыстасоўвацца да зменлівых ўмоў жыцця і працы, здольныя самастойна набываць новыя веды і творча выкарыстоўваць іх у сваёй прафесійнай дзейнасці. Гэта ў поўнай меры адносіцца і да педагагічных кадраў, у прыватнасці, настаўнікаў пачатковых класаў. Агульная культура і прафесійны ўзровень настаўнікаў першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі сёння вызначаецца не толькі і не столькі ўжо набытымі ведамі, колькі ўменнем набываць іх у далейшым шляхам самаадукацыі.

Гатоўнасць маладога настаўніка пачатковай школы да самаадукацыйнай дзейнасці з’яўляецца сацыяльным заказам грамадства і такія ўменні неабходна фарміраваць у гады навучання ва ўніверсітэце. Гэта ў поўнай меры адпавядае патрабаванню базавага прынцыпу Балонскай дэкларацыі аб неабходнасці падрыхтоўкі студэнтаў да самаадукацыі.

Як следства, адна з асноўных задач устаноў вышэйшай педагагічнай адукацыі заключаецца ў падрыхтоўцы настаўніка пачатковых класаў з высокім узроўнем адукацыі, культуры, інтэлігентнасці, прафесійнай кампетэнтнасці, здольнага забяспечыць усеагульнае развіццё дзіцяці як асобы і вышэйшай каштоўнасці грамадства, гатовага да бесперапыннай свядомай самаадукацыі, развіцця і самаўдасканалення.

Як навуковая праблема самаадукацыя пачала даследавацца ў 70-х гадах XX стагоддзя. Менавіта ў гэты час з’явілася шэраг прац, прысвечаных выяўленню сутнасці самаадукацыі, кампанентаў самаадукацыйнай дзейнасці, педагагічных умоў фарміравання гатоўнасці да самаадукаццыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Трэба адзначыць, што ў трактоўцы паняцця “самаадукацыя” адзінства сярод даследчыкаў няма. Мы падзяляем погляд тых навукоўцаў, якія разглядаюць самаадукацыю як форму пазнавальнай дзейнасці, што характарызуецца актыўнасцю, самастойнасцю, добраахвотнасцю і накіраванасцю на развіццё разумовых сіл і здольнасцяў, фарміраванне культуры разумовай працы.

У тэорыі самаадукацыйнай дзейнасці часта як сінонім паняцця “самаадукацыя” выкарыстоўваецца паняцце “самастойная вучэбная работа”, што прыводзіць да складанасці разумення іх зместу. У многім гэта абумоўлена тым, што “самаадукацыя” як педагагічная катэгорыя развівалася на аснове паняцця “самастойная работа”. Прынцыповае адрозненне паміж самастойнай работай і самаадукацыяй мы бачым ў тым, што пры арганізацыі самастойнай работы студэнта мэту перад ім ставіць выкладчык, а ў працэсе самаадукацыі ён выступае суб’ектам сваёй дзейнасці па дасягненні самастойна вызначаных мэт. У дадзеным выпадку самастойная работа выступае як спосаб рэалізацыі адукацыі і самаадукацыі студэнта. Роля выкладчыка ў працэсе самаадукацыйнай дзейнасці студэнта заключаецца толькі ў апасродкаванай карэкцыі дзейнасці студэнта пад час кансультацый.

Гатоўнасць настаўніка да самаадукацыйнай дзейнасці забяспечвае рэалізацыю наступных функцый: набыцця і назапашвання новых прафесійных ведаў; самаразвіцця, што праяўляецца ва ўдасканаленні якасцяў асобы; метадычную, якая звязана з пераадольваннем прафесійнай вузкасці асобы; творчую, якая садзейнічае творчай самарэалізацыі.

Для паспяховага фарміравання гатоўнасці да самаадукацыйнай дзейнасці вельмі важнай з’яўляецца дыягностыка ўзроўню ўменняў студэнтаў да гэтай дзейнасці, згодна з якімі павінны быць распрацаваны індывідуальныя траекторыі самаадукацыі.

Даследчыкі праблемы самаадукацыі выдзяляюць тры ўзроўні гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыйнай дзейнасці: высокі, сярэдні і нізкі.

Высокі ўзровень гатоўнасці прадугледжвае дакладнае ўяўленне пра сфарміраванасць самаадукацыйнай культуры. Студэнты вызначаюцца стойкімі ўменнямі і спосабамі самаадукацыйнай дзейнасці, рэфклексіўным стаўленнем да навучання, характарызуюцца ініцыятыўнасцю, здольнасцю да кантролю, уменнем планаваць самастойную пазнавальную дзейнасць і самастойна пераадольваць цяжкасці, якія ўзнікаюць.

Сярэдні ўзровень гатоўнасці характарызуецца недастатковым праяўленнем сфарміраванасці ўяўлення пра самаадукацыйны працэс. Студэнты засвоілі ўменні і спосабы самаадукацыі, але працэсы самаадукацыйнай дзейнасці адбываюцца недастаткова актыўна, праяўляецца несвядомы характар матываў пазнавальных дасягненняў. Студэнты добра выконваюць работу па гатовых планах і не заўсёды гатовы пераадольваць цяжкасці, што ўзнікаюць у пазнавальнай дзейнасці.

Для нізкага ўзроўню характэрна рэпрадуктыўнае выкарыстанне ведаў, уменняў і навыкаў. Студэнты адчуваюць цяжкасці на ўсіх этапах

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

самаадукацыйнай дзейнасці, пад час выканання самастойнай работы патрабуюць педагагічнай дапамогі выкладчыка.

Праведзенае намі даследаванне з мэтай вызначыць узровень гатоўнасці да самаадукацыі студэнтаў першага курса факультэта пачатковай адукацыі паказала, што пераважная большасць з іх валодае дастаткова высокай матывацыяй да гэтага віду дзейнасці. Студэнты падтрымліваюць меркаванне аб актуальнасці і неабходнасці самаадукацыі, аднак не ўсведамляюць, што гэта дзейнасць і для яе эфектыўнага ажыццяўлення, акрамя матывацыі і працаздольнасці, неабходны ўменні і навыкі, у тым ліку самаарганізацыі і самакіравання. Акрамя таго, многія студэнты не разумеюць сутнасць самаадукацыйнай дзейнасці. З ліку апытаных 34 % адзначылі, што яны “маюць частковае ўяўленне, але не могуць вызначыць дакладна”, 3 % наогул не мелі ўяўлення. Праведзены намі эксперымент дае падставу зрабіць выснову, што ў большасці студэнтаў-першакурснікаў факультэта ўменні і навыкі самаадукацыйнай дзейнасці сфарміраваны недастаткова.

Такім чынам, для павышэння эфектыўнасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў пачатковых класаў важнае значэнне набывае сістэмная работа, якая арыентуе будучых спецыялістаў на самаадукацыю, спрыяе набыццю імі неабходных ведаў, уменняў і навыкаў самаадуккацыйнай дзейнасці.

Падрыхтоўка будучых настаўнікаў пачатковых класаў да самаадукацыйнай дзейнасці, якая разглядаецца ў псіхолага-педагагічных работах навукоўцаў і практыкаў, дае падставу сцвярджаць, што яна з’яўляецца складаным мэтанакіраваным працэсам.

Згодна канцэпцыі, распрацаваній П. І. Підкасістым і Л. М. Фрыдманам, працэс падрыхтоўкі студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў павінен асноўвацца на наступных палажэннях:

- мэтанакіраванае фарміраванне ў асобы гатоўнасці да самаадукацыі – адна з асноўных задач сістэмы адукацыі;
- выхаванне, адукацыя, развіццё і прафесійная падрыхтоўка студэнтаў павінны ажыццяўляцца на аснове непарыўнай узаемасувязі навучання з іх самаадукацыйнай дзейнасцю, навукова-даследчай работай, удзелам у вырашэнні практычных задач;
- усе намаганні педагагічнага працэсу павінны быць накіраваны на павышэнне ўзроўню гатоўнасці асобы да самаадукацыі;
- у студэнтаў паслядоўна павінна фарміравацца патрэба карыстацца самаадукацыяй як спосабам вырашэння сацыяльна значных задач і задавальнення сваіх інтарэсаў;
- паступовае ператварэнне цэласнага педагагічнага працэсу ў самаадукацыйны [1].

Падсумоўваючы сказанае, трэба адзначыць, што арганічай, неабходнай састаўляючай прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў пачатковых класаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі на сучасным этапе з’яўляецца іх падрыхтоўка да бесперапыннай самаадукацыйнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аналіз навуковай літаратуры па праблеме падрыхтоўкі будучых настаўнікаў пачатковых класаў да самаадукацыйнай дзейнасці сведчыць, што традыцыйны падыход у арганізацыі вучэбнага працэсу не дазваляе ў поўнай меры забяспечыць паўнацэннае стымуляванне і матывацыю студэнтаў да самаадукацыйнай дзейнасці. Стратэгічным канцэптуальным арыенцірам мадэліравання працэсу падрыхтоўкі будучых настаўнікаў павінен стаць прынцып арганізацыі вучэбнага працэсу, у адпаведнасці з якім акцэнт перамяшчаецца з адукацыі на самаадукацыю. Гэта арыентуе на пашырэнне самастойнасці будучых спецыялістаў, што прадугледжвае самастойны пошук і засваенне студэнтамі новай інфармацыі, арганізацыю дзейнасці, накіраванай на ўласнае самаразвіццё.

Літаратура:

1. Пидкасистый, П. И. Психолого-дидактический справочник преподавателя высшей школы. / П. И. Пидкасистый, Л. М. Фридман, М. Г. Гарунов – М.: Педагогическое общество России, 1999. – 354 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ